Итак, символы родом из 1812-го года не просто сохраняли историческую память в культуре советского народа. Они придавали уверенность в своих силах и давали дополнительную энергию нашим воинам, всем гражданам Советского Союза в борьбе за национальную независимость.


1. Антология военной песни / сост. и автор предисл. В. Калугин. – М.: Эксмо, 2006.
2. Брагин, М. Кутузов / М. Брагин. – М.: Молодая гвардия, 1970.
3. В боях и походах: песни Великой Отечественной войны / сост. П.Ф. Лебедев. – М.: Сов. композитор, 1975.
4. Долматовский, Е.А. Всадники, песни, дороги / Е.А. Долматовский – М.: Воениздат, 1973.
5. Налчаджян, А.А. Этнопсихология / А.А. Налчаджян. – СПб.: Питер, 2004.
6. Священная война. Песни Победы / сост. В.А. Костров, Г.Н. Красников. – М.: Олимп, 2005.
7. Слово товарищу Сталину. – М.: Эксмо, 2002.
8. Электронный ресурс. – Режим доступа: www.pesnyary.ru
9. Электронный ресурс. – Режим доступа: www.SovMusic.ru



**К.Р. Карпекін**


## АДЛЮСТРАВАННЕ ПАДЗЕЙ ВАЙНЫ 1812 Г. У ВУСНАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ (ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ЛЁЗНЕНШЧЫНЫ)

Руска-французская вайна 1812 г. зрабіла значны адбітак у гісторыі Беларусі: на працягу 7-мі месяцаў на тэрыторыі краіны вяліся баявыя дзеянні, у выніку якіх яна панесла адчувальныя людскія і матэрыяльныя страты. У сувязі з гэтым заканамерным з’яўляецца тое, што падзеі дадзенай вайны трывала замацаваліся ў людской памяці, азгадкі пра яе захаваліся ў вуснай народнай творчасці.

Мэтай даследавання з’яўляецца аналіз фальклору, у якім тым ці іншым чынам адлюстраваліся падзеі вайны 1812 г.

Геаграфічныя межы працы – тэрыторыя сучаснага Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. У пачатку XIX ст. яго цэнтральная і паўднёвая часткі ўваходзілі ў склад Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні, праз тэрыторыю якога летам 1812 г. прайшлі асноўныя сілы арміі Напалеона Банапарта.

Крыніцазнаўчай базай даследавання сталі аповеды карэнных жыхароў, зафіксаваныя аўтарам у пачатку 2000-х гг.

Адно з паданняў прысвечана прасоўванню французскіх войскаў з Віцебска на Смаленск. Іх шлях праходзіў праз Лёзна. У той час на ўсходняй ускраіне мястэчка рос стары дуб. Ён быў настолькі вялізным і разгалістым, што нярэдка ў час дажджу пад ім хаваліся падарожнікі. Пад дрэвам магло свабодна размясціцца некалькі падвод разам з людзьмі і коньмі. Праязджаючы акурат каля гэтага дрэва, імператар Напалеон загадаў сваім салдатам вырваць яго з зямлі і пасадзіць галлём уніз. Пры гэтым ён прамовіў: “Як дубу больш не расці, так і рускаму цару тут не ўладарыць!” Спадзяванні французскага імператара не спраўдзіліся: праз колькі часу дуб зазелянеў як ні ў чым не бывала. Ён, нібыта, стаяў яшчэ і пасля Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. і вонкава быў вельмі прыкметным, бо галлё ў яго расло не да сонца, як у астатніх дрэваў, а да зямлі [3].

Дадзенае паданне сведчыць пра адмоўнае стаўленне мясцовага насельніцтва да французаў. Як вядома, дуб з’яўляецца адным з самых шануемых беларусамі дрэваў, сімвалам вечнага жыцця [2, с. 153]. Адпаведна, асобы, якія ажыццяўлялі замах на такі аб’ект, успрымаліся як захопнікі і не маглі разлічваць на павагу з боку местачкоўцаў. Пра гэта ж сведчыць і фінал падання пра ажыванне дрэва, сугучнае паразе французаў у вайне.

Рэпазіторый ВДУ

Неабходна падкрэсліць, што паданне з'яўляецца адлюстраваннем рэальных падзей,якія два стагоддзі таму назад адбываліся ў гэтай мясцовасці. Частка французскіх войскаў сапраўды праходзіла праз Лёзна. Праўда, камандаваў імі маршал Ней, а не Напалеон, які з Віцебска рушыў на ўсход праз Крынкі і Бабінавічы [1, с. 3]. Дадзены аповед можна лічыць не толькі асэнсаваннем ваенных падзей, але і спробай мясцовага насельніцтва растлумачыць незвычайны выгляд дрэва, якое, нагадаем, мела галлё, растучае ўніз.

Падзеі вайны 1812 г. знайшлі яшчэ адно адлюстраванне ў беларускім фальклоры. Гаворка ідзе пра старажытныя курганы, якія лічыліся пахаваннямі французскіх салдат. Напрыклад, узгорак пад назвай "Напалеонаўская Валатоўка" знаходзіцца на паўднёва-заходняй ускраіне в. Кучыншчына. Гэты курган быў выяўлены беларускімі археолагамі ў 1981 г. [6, с. 297].

Паводле ўспамінаў мясцовага насельніцтва Лёзненшчыны, "Французскія Валатоўкі" знаходзіліся таксама каля вёсак Баравая і Чарнаручча (у навуковай літаратуры яны не зафіксаваны).

Некалькі паданняў захавалася пра курганы ў в. Замошша. Шмат іх знаходзілася ў гэтак званых Завалоках – хмызняках, размешчаных на ўсход ад вёскі. Згодна з успамінамі, гэтыя валатоўкі мелі прадаўгаватую форму (каля 2-х м. даўжынёй і каля 1-го м. шырынёй), вышыню – 0,5 – 1 м. Адзін з вяскоўцаў, пасвячы ўночы коней, бачыў там ката, ад якога зыходзіла вельмі яркае ззянне. Гэта было яўнай прыкметай таго, што ў курганах былі закапаныя скарбы [3].

Адна валатоўка мясцілася на тэрыторыі вёскі (у яе заходняй частцы). Пад час Вялікай Айчыннай вайны 1941 – 1945 гг. в. Замошшацалкам была спалена фашысцкім карным атрадам, таму вяскоўцы вымушаны былі будаваць сабе зямлянкі. Адзін з сялян, на чыім агародзе знаходзілася валатоўка, вырашыў зрабіць сабе часовае жытло непасрэдна ў кургане. Раскопваючы насып, ён таксама спадзяваўся знайсці залатыя зубы ці якія-небудзь каштоўнасці, але яму патрапіліся толькі вялікія чалавечыя косці і чэрап з густымі кучаравымі чорнымі валасамі. Пасля таго, як той гаспадар адбудаваў сабе нармальную хату, косці зноў закапалі ў курган [5].

Праз некалькі гадоў той самы чалавек вырашыў зрабіць на кургане лазню. У пасляваенны час у вёсцы лазні былі далёка не ў кожным двары, таму да гаспадара прыходзілі мыцца яго суседзі, хоць і лічылі месца, выбранае для лазні, дзіўным і зусім не падыходзячым. Многія з іх расказвалі, што як толькі яны збіраліся парыцца, то пад падлогай нехта пачынаў грукацца і скрэбсціся. Гэты, нібыта, былі нябожчыкі, пахаваныя ў кургане. Некаторыя вяскоўцы нават уцякалі з тойлазні, не дамыўшыся [3].

Паданні пра "Французскія Валатоўкі" можна лічыць спробай вяскоўцаў знайсці прычыну ўзнікнення незвычайных узгоркаў. Падсвядома сяляне адчувалі, што курганынасыпаны людзьмі. Імкненне асэнсаваць дадзеную з'яву спалучылася з успамінамі продкаў пра вайну з французамі. У выніку ўзніклі паданні пра магілы іншаземных заваёўнікаў і закапаныя імі скарбы, якія праяўляюцца ў выглядзе незвычайных жывёлін. Такія паданні – тыповыя для Беларусі [2, с. 468–470, 523–524]. Сёння археолагі ў значнай колькасці выпадкаў пацвярджаюць, што "Французскія Валатоўкі" – гэта пахаванні эпохі першабытна-абшчыннага ладу ці сярэднявечча.

Варта адзначыць, што пэўныя падставы для ўзнікнення паданняў пра прысутнасць у гэтых мясцінах французаў мелі месца быць. Справа ў тым, што вёскі Баравая, Замошша, Кучыншчына, Чарнаручча знаходзіліся непадалёк ад шляхоў, па якіх праходзілі войскі Напалеона. Ёсць вялікая верагоднасць таго, што мясцо-



Репозиторий ВГУ

вае насельніцтва магло сутыкацца з імі пад час рэквізіцый прадуктаў харчавання, фуражу.

"Французская Валатоўка" на тэрыторыі в. Замошша захавалася да нашых дзён. Яна ўяўляе сабой здзірванелы ўзгорак, круглы ў плане, моцна скапаны зверху. Аўтарам неаднаразова ажыццяўляліся спробы знайсці курганы ў Завалоках (у 2009 і 2011 гг.). Тым не менш, усе яны скончыліся беспаспяхова. Калі валатоўкі там і існавалі, яны маглі быць знішчанымі ў выніку торфанарыхтоўчых работ, якія вяліся на той тэрыторыі.

У Лёзненскім раёне зафіксавана яшчэ адно паданне, звязанае з падзеямі вайны 1812 г. Вяскоўцы расказваюць, што ў в. Матушова ёсць вялізны пагорак, насыпаны над мураваным склепам. Уваход у яго знаходзіцца пад вадой (побач з узгоркам працякае рачулка). Менавіта ў гэты склеп схаваў нарабаваныя багацці Напалеон: залатую карэту, напоўненую грашыма і ўпрыгажэннямі.

Адначасова расказваюць і другі варыянт гэтага падання. Нібыта, на ўзгорку калісьці вельмі даўно стаяў палац нейкага князя, які ў падземных сутарэннях хаваў свае багацці: каня, цалкам выробленага з золата, і бочку віна. Той, хто зможа дабрацца да іх, мае поўнае права завалодаць і каштоўным металам, і пітвом [4].

Прычынамі ўзнікнення такіх паданняў можна лічыць дакладна вядомы факт прысутнасці французскіх войскаў у Матушове: летам 1812 г. тут 2 тыдні запар прастаялі злучэнні караля неапалітанскага Мюрата [1, с. 3]. Акрамя таго, вядома, што на апісаным узвышшы знаходзілася сядзіба тамтэйшага памешчыка. Гэтым жа тлумачацца і пастаянныя спробы знайсці скарбы. Напрыклад, колішні старшыня калгаса хацеў асушыць рэчку, каб праз уваход патрапіць у скляпенні. Праўда, гэтага яму не дазволілі зрабіць вяскоўцы, бо на той час у рэчцы вадзілася шмат рыбы. Тады пад кіраўніцтвам таго ж старшыні ў Матушова прыгналі экскаватар, каб разбурыць сцены скляпення. Задума скончылася няўдачай, паколькі муроўкааказалася вельмі моцнай. Аднаму з вяскоўцаў, нібыта, пашчасціла больш: ён здолеў прабіць столь скляпення звычайным ломам. Але лом выслізнуў з рук і ляцеў досыць доўга, пакуль не грукнуўся аб дол – такімі высокімі аказаліся сутарэнні. Да золата той вясковец так і не дабраўся.

Такім чынам, вайна 1812 г. досыць шырока прадстаўлена ў беларускім фальклоры. У паданнях, зафіксаваных на Лёзненшчыне, знайшлі сваё адлюстраванне ўсе яе асноўныя этапы: наступленне французскіх войскаў, пахаванні загінулых іншаземных захопнікаў, уцёкі Напалеона з нарабаванымі багаццямі. Узнікненне такога фальклору варта лічыць вынікам захавання ў народнай памяці звестак пра рэальныя гістарычныя падзеі і адначасова – спробай беларусаў растлумачыць паходжанне незвычайных прыродных і антрапагенных аб'ектаў.


1. Бандарэнка, У. Наш край у 1812 годзе / У. Бандарэнка // Сцяг Перамогі. – 2000. – 16 мая. – С. 3–4.
2. Беларуская міфалогія: энц. слоўнік / рэд. кал.: С. Санько [і інш.]. – 2-ое выд., дап. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.
3. Запісана Карпекіным К.Р. у 2000 г. ад Казлоўскай В.І., 1921 г. нар., у в. Якубаўшчына Лёзненскага раёна, да 1981 г. жыла ў в. Замошша Лёзненскага раёна.
4. Запісана Карпекіным К.Р. у 2007 г. ад Лабанава П.П., 1941 г. нар., у в. Куляціна Лёзненскага раёна.
5. Запісана Карпекіным К.Р. у 2008 г. ад Лішаковай В.М., 1930 г. нар., у в. Замошша Лёзненскага раёна.
6. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэд. кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1985. – 496 с.


Репозиторий ВГУ